**Падагульненне і сістэматызацыявывучанага па тэме "Прыметнік"**

**Ж. Л. Васюковіч**,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры першай катэгорыі,
СШ № 15 г. Пінска"

**Мэта** – стварыць умовы для падагульнення і сістэматызацыі ведаў вучняў па асноўных пытаннях тэмы.

**Задачы:**

- удасканальвацьуменніадрознівацьпрыметнікі ў тэкстах, даваць марфалагічную і словаўтваральную характарыстыкупрыметнікам, выкарыстоўвацьстылістычныя і выяўленчыя магчымасці прыметнікаў ва ўласным маўленні;
- актуалізаваць навыкі правапісу прыметнікаў;
- выхоўваць любоў да радзімы.

**Форма правядзення**: урок-падарожжа

**Абсталяванне:** беларускаямова: вучэб. дапам. для 6-га кл.агульнаадукац. установ з бел. I рус. Мовамінавучання/В.П.Красней, Я.М.Лаўрэль, С.Р.Рачэўскі. – Мінск: Нац. Ін-т адук., 2009; карта краіна "Прыметнік", мультымедыйная прэзентацыя, "матылькі" на рэфлексію.

**Ход урока**

- **Арганізацыйны момант**

  **Стварэнне эмацыянальнага настрою.**

  **Настаўнік.**

У адным горадзе жыў вялікі мудрэц. Слава пра яго мудрасць пайшла па ўсёй краіне. Але адзін чалавек зайздросціў яго славе і вырашыў прыдумаць такое пытанне, на якое не змог бы даць адказ мудрэц. Паклаў матылька паміж далоняў і спытаў у мудраца: "Які матылёк у мяне ў руках – жывы ці мёртвы?" А сам падумаў, калі мудрэц адкажа, што жывы, я сцісну далоні – і матылёк памрэ, а калі скажа – мёртвы, я раскрыю далоні і матылёк паляціць.

Але мудрэц быў вельмі разумным чалавекам ,ён адказаў: "Усё ў тваіх руках!"

Настаўнік. Мне б хацелася, каб вы запомнілі прытчу і ведалі, што ўсё ў вашых руках: вучоба, добрыя паводзіны, вынікі працы на сённяшнім занятку. (На партах у кожнага вучня ляжаць "матылькі").

- **Паведамленнетэмы і мэт урока**

**Настаўнік**. Сёння мы з вамі здзейснім падарожжа па адной з краін марфалогіі, а як яна называецца, даведаецеся, калі адгадаеце загадку.

Мы з назоўнікам – браты
Кажа мне назоўнік: "Ты і адметны, і прыгожы,

Разам многае мы зможам.
Мы ж часціныроднаймовы,
Як дзівосна: Ліст – вярбовы!
Запаветная краіна і зімовая каліна!
На адной стаім мяжы.
Як завуць мяне, скажы? (слайд 1)

(Вучні адказваюць: “Прыметнік” (слайд 2). На дошцы вывешваецца карта маршруту “КраінаПрыметнік”).

**Настаўнік**. У час падарожжа мы паспрабуем уявіць, што прыметнік не проста часціна мовы, а сапраўдная краіна, дзе дзейнічаюць свае законы і правіла. Як сапраўдныя вандроўнікі, стараюцца набыць сабе што-небудзь на памяць, так і мы з вамі возьмем для сябе веды аб прыметніку. Падчас падарожжа мы іх падсумуем, успомнім найбольш значныя прыметы гэтай часціны мовы.

- **Асэнсаванне зместу вывучанага матэрыялу**

Перад дарогай неабходна сабраць багаж (тэарэтычныя веды).

**Разгадванне крыжаванкі.**



1. Разрад прыметнікаў, які паказвае на прыналежнасць прадмета асобе ці жывой істоце.
2. Разрад прыметнікаў, які можа ўтвараць ступені параўнання.
3. Разрад прыметнікаў, які абазначае прымету прадмета праз яго адносіны да іншых прадметаў.
4. Якім членам сказа часцей за ўсё з’яўляецца прыметнік.
5. Якім членам сказа з’яўляецца кароткая форма прыметніка.
6. Да якой группы часцін мовы адносіцца прыметнік.
7. Адна са ступеней параўнання прыметнікаў, якая паказвае, што якасць гэтаму прадмету ўласціва ў найбольшай ступені.

**Адказы**: 1 – прыналежны; 2 – якасны; 3 – адносны; 4 – азначэнне; 5 – выказнік; 6 –самастойная; 7 – найвышэйшая.

Зашыфраванае слова – Радзіма (лексічная тэма ўрока).

**Настаўнік.** Багаж сабраны – і мы на вакзале. Ад нас патрабуецца канцэнтрацыя ўвагі.

**Гульня “Самы ўважлівы”**

Заданне на развіццё зрокавай памяці (на дошцы напісаны словы, вучні чытаюць, запамінаюць, настаўнік закрывае дошку). Вучні, адказваючы на пытанні, даюць словаўтваральную і марфалагічную характарыстыку прыметнікам.

Самы разумны, цётчын, гусцейшы, наваполацкі, калмыцкі, высока, вераб'іны, сонечны.

1. Назваць прыналежны прыметнік (цётчын).
2. Назваць складаны прыметнік (наваполацкі).
3. Назваць прыметнік ў простай форме вышэйшай ступені параўнання (гусцейшы).
4. Назваць прыметнік у складанай форме найвышэйшай ступені параўнання (саамы разумны).
5. Назваць слова на правапіс–н,нн- у прыметніках (вераб'іны).
6. Назваць прыметнік, які з'яўляецца выключэннем з правіла "Правапіс суфікса–ск –" (калмыцкі).
7. Сярод прыметнікаў было прыслоўе (высока).
8. Назваць прыметнік, які характарызуе сённяшні дзень (сонечны).

1.**Прыпынак "Марфалагічныя прыметы"**

**Праца з вершам**

**Настаўнік**. Мы адпраўляемся ў падарожжа. У краіне "Прыметнік" на галоўным праспекце нас сустракае спадарыня Граматыка (гл.карту, дадатак 1). Яна сцвярджае, што немагчыма знайсці тэкст, каб у ім не было прыметнікаў. Давайце вызначым, ці так гэта на самай справе? Чытанне верша.

Вядома ўсім, што вельмі шмат
Куткоў на свеце дзіўн…,
Але не менш, а болей, брат,
Іх на тваёй радзіме,
У нашым краі дараг…,
У Беларусі родн….
Не паммяняешся ні з кім
Яе красою годн…

- Якой тэме прысвечаны верш? (тэма Радзімы)
- Якой уяўляецца Радзіма паэту?
- Пры дапамозе якіх слоў аўтар змог паказаць прыгажосць Радзімы? (прыметнікаў)
- Якая роля прыметнікаў у маўленні? (упрыгожваюць маўленне, робяць мову больш дакладнай, яркай, вобразнай, маляўнічай).

**Заданне**. Выпісаць з верша прыметнікі разам з назоўнікамі, дапісаць канчаткі, вызначыць марфалагічныя прыметы і сінтаксічную ролю прыметнікаў (слайд 3).

**Узор выканання:**

Дзіўных куткоў (мн.л., Р.скл, азначэнне), у краі дарагім (адз.л., М.скл., м.р., азначэнне), у Беларусі роднай (адз.л., М.скл., ж.р., азначэнне), красою годнай (адз.л., Т.скл., ж.р., азначэнне).

**2. Прыпынак "Род".**

**Гульня "Перакладчык" (рассяленне ў гасцініцы (гл. карту).**

Мы спыніліся каля гасцініцы і павінны засяліцца ў яе.

**Заданне.**Неабходна перакласці словазлучэнні на беларускую мову і размеркаваць на 3 групкі (3 паверхі) (1 рад – м.р.; 2 рад – ж.р.; 3 рад – н.р.).

- Як вызначыць род прыметнікаў? (па назоўніках)
- Ці супадае род гэтых назоўнікаў у рускай і беларускай мовах?

Золотая медаль, белый гусь, сильная боль, актовый зал, кислый щавель, красивый жираф, широкая степь, маленький котёнок, яркий свет.

**Узор выканання:**

1 рад (паверх): залаты медаль, моцны боль, шырокі стэп.

2 рад (паверх): белая гусь, актавая зала, прыгожая жырафа.

3 рад (паверх): кіслае шчаўе, маленькае кацяня, яркае святло.

**3. Прыпынак "Разрады прыметнікаў".**

**Размеркавальны дыктант "Чыё гэта"**

**Настаўнік.** Мы спыняемся каля трох вуліц. Як яны называюцца?

Здарылася так, што прыметнікі заблыталіся, і спадарыня Граматыка не ведае, да якога з разрадаў трэба аднесці кожны з прыметнікаў.

**Заданне:** размеркаваць прыметнікі на 3 слупкі (якасныя, адносныя і прыналежныя).

Цёплы, гарадскі, мяккі, Сяргееў, бетонны, лісіны, шчаслівы, восеньскі, вавёрчын, пяшчотны, пясчаны, Сашаў.

**Узор выканання: (слайд 4)**

| **Якасны** | **Адносны** | **Прыналежны** |
|---|---|---|
| Цёплы | гарадскі | Сяргееў |
| Мяккі | бетоны | лісіны |
| Шчаслівы | восеньскі | вавёрчын |
| Пяшчотны | пясчаны | Сашаў |

Растлумачыць правапіс вялікай літары ў словах Сяргееў і Сашаў.

**Настаўнік**. Як бачыце, вуліцы перакрыжоўваюцца паміж сабой.

**Заданне (вусна**). Прыдумаць па тры пары словазлучэнняў, кааб прыметнікі з аднаго разраду пераходзілі ў другі.

**Узор выканання:**

Стальная дэталь (адн) – стальныя нервы (як)

Залаты пярсцёнак (адн) – залатыя валасы (як)

Вішнёвы сок (адн) – вішнёвы колер (як).

**Настаўнік.**Спадарыня Граматыка прапануе нам затрымацца на вуліцы "Прыналежныя" і дапамагчы ёй.

**Заданне.** Ад назоўнікаў утварыць прыналежныя прыметнікі (па варыянтах).

**Узор выканання: (слайд 5)**

| | |
|---|---|
| Коля – Колеў | Аленка – Аленчын |
| вавёрка – вавёрчын | рыбак – рыбакоў |

брыгадзір – брыгадзіраў Насця – Насцін
гусь – гусін каваль - кавалёў
маці – матчын мама – мамін
Растлумачыць правапіс вялікай літары ў прыналежных прыметніках.

**4. Прыпынак. Плошча “Ступені параўнання”**

**Настаўнік.** Рухаемся далей да плошчы “Ступені параўнання”.

**Гульня “Трэці лішні”**

**Заданне.** У кожным радзе вызначыць адно лішняе слова і патлумачыць чаму.

1. **Самы найпрыгажэйшы**, самы разумны, найбольш смелы (самы найпрыгажэйшы – няправільна ўтворана ступень параўнання (самы прыгожы).
2. Найдаражэйшы, найтанчэйшы, **найхутчэй** (найхутчэй – прыслоўе).
3. Большы за яго, **дрэннейшы,** меншы (дрэннейшы – неабходна горшы).
4. **Самы вусаты**, саамы высокі, самы тонкі (саамы вусаты – не ўтварае ступень параўнання) (слайд 6).

**Хвіліна адпачынку “Упрыгожваем слова” (слайд 7).**

Лексічная тэма ўрока – Радзіма. Упрыгожым слова Радзіма прыметнікамі (родная, любімая, самая лепшая, прыгожая, сінявокая, загадкавая, чароўная, азёрная, дзіўная…)

**5.Прыпынак. “Правапіс суфіксаў прыметнікаў”**

**Гульня “Карэктар”** (выправіць памылкі)

Палымянны, каўкаскі, ветранны, племяны, брацкі, беларусскі, лідскі, парышскія, восенскі, турыстскі, славацкі, гарацкі, Канадскі, чыкахскі.

**Узор выканання: (слайд 8)**

Палымяны, каўказскі, ветраны, племянны, брацкі, беларускі, лідскі, парыжскі, восеньскі, турысцкі, славацкі, гарадскі, канадскі, чыкагскі.

**6.Прыпынак. “Правапіс не(ня) з прыметнікамі”**

**Гульня “Выбар”**

**Заданне.** Выбраць 1 в. – не(ня) разам; 2 в. – не(ня) асобна.

(Не)гарачая, а цёплая кава; (не)дарагі касцюм; (не)чорны колер; (не)адольны сон; далёка (не) бліскучы адказ; (не) свежы хлеб; (не)вялікі, але ўтульны пакой; (не)бацькаў касцюм; (не) кісла-салодкі смак; (не)вясёлыя песні; (не)ўклюдны хлопец.

**Узор выканання: (слайд 9)**

1 в. – недарагі касцюм; неадольны сон; нясвежы хлеб; невялікі, але ўтульны пакой; невясёлыя песні; няўклюдны хлопец.

2 в. – не гарачая, а цёплая кава; не чорны колер; далёка не бліскучы адказ; не бацькаў касцюм; не кісла-салодкі смак.

**7.Прыпынак. “Правапіс складаных прыметнікаў” (у кожнага вучня на парце)**

**Заданне.**Абазначце складаныя прыметнікі, якія пішуцца разам, пазначце нумары правільных адказаў у суадносных клетках зорачкамі і злучыце іх.

| | | |
|---|---|---|
| 1 | **2*** | **3*** |
| 4 | **5*** | **6*** |
| 7 | 8 | **9*** |
| 10 | **11*** | **12*** |

1. Залаціста(ружовы)
2. Інша(моўны)
3. Бела(грывы)
4. Паўночна(заходні)
5. Блакітна(вокі)
6. Руса(валосы)
7. Горка(салёны)
8. Шахматна(шашачны)
9. Вечна(зялёны)
10. Руска(беларускі)
11. Сарака(тонны)
12. Заходне(беларускі)

- Хто справіўся правільна з заданнем, у таго павінна атрымацца "дзявятка" (слайд 10).

**8.Прыпынак. "Марфалагічны разбор"**

**Гульня "Правяраюсябе"**

**Настаўнік.** Наша падарожжа завяршаецца, і нас чакае апошні прыпынак.

**Заданне:** з першага сказа выпішыце адзін прыметнік (на выбар) і зрабіце пісьмовы разбор.

Святая беларуская зямля, мілая і дарагая сэрцу мясціна. Край паэтаў і ваяроў, рамантыкаў і шчырых духам людзей. Яго любяць пяшчотна і раўніватыя, хто тут нарадзіўся; узнёсла і аддана тыя, хто хоць раз наведаў гэты цудоўны куток.

**Узор выканання:**

Святая (зямля) – прыметнік, святы; якасны, поўн.ф., адз.л., ж.р., Н.скл; азначэнне.

- **Падвядзенне вынікаў урока. Рэфлексія**

**Настаўнік**. Вось і заканчваецца наша падарожжа.

- Ці карысным было гэта падарожжа для вас?
- Ці засвоілі вы тэму "Прыметнік"?
- Хто з вас можа ўтрымаць "матылька" ў сваіх руках?

Патрымайце "матылька" ў руках і, паставіўшы на ім сабе адзнаку за ўрок, упрыгожце нашу краіну (малюнак "Мая Беларусь") (гл. дадатак 2).

**Y. Дамашняезаданне**

Напісаць міні-сачыненне "Падарожжа па краіне "Прыметнік".

Мы з назоўнікам – браты.
Кажа мне назоўнік: - Ты
І адметны і прыгожы,
Разам многае мы зможам.
Мы ж часціны роднай мовы,
Як дзівосна: Ліст – Вярбовы!
Запаветная – Краіна!
І Зімовая – Каліна!
На адной стаім мяжы.
Як завуць мяне, скажы!
Л. Забалоцкая

# У краіне прыметнікаў

# Знайдзі пару

Вядома ўсім, што вельмі шмат
Куткоў на свеце дзіўных,
Але не менш, а болей, брат,
Іх на тваёй радзіме,
У нашым краі дарагім,
У Беларусі роднай.
Не памяняешся ні з кім
Яе красою годнай.



# «Чыё гэта?»

| Якасныя | Адносныя | Прыналежныя |
|---|---|---|
| Цёплы, шчаслівы, пяшчотны, мяккі. | Гарадскі, бетонны, восеньскі, пясчаны. | Сяргееў, лісіны, вавёрчын, Сашаў. |

# Прыналежныя прыметнікі

Колеў, вавёрчын,
брыгадзіраў, гусін,
матчын, Алёнчын,
рыбакоў, Насцін,
кавалёў, мамін

# “Трэці лішні”

1. Самы найпрыгайшэйны, самы разумны, найбольш смелы.
2. Найдаражэйшы, найтанчэйшы, найхутчэй.
3. Большы за яго, дрэннейшы, меншы.
4. Самы вусаты, самы высокі, самы тонкі


Мая Беларусь!

# “Карэктар”



Палымяны, каўказскі, ветраны, племянны, брацкі, беларускі, лідскі, парыжскі, восеньскі, турысцкі, славацкі, гарадскі, канадскі, чыкагскі

# "Выбар"

| асобна | разам |
| --- | --- |
| Не гарачая, а цёплая кава; не чорны колер; далёка не бліскучы адказ; не бацькаў касцюм; не кісла-салодкі смак; | недарагі касцюм; неадольны сон; нясвежы хлеб; невялікі, але ўтульны пакой; невясёлыя песні; няўклюдны хлопец. |




1
2
3
4
5
6
7
8
9
10
11
12